# ИСТОРИЯ

**С.Я. Новікаў**

## РАЗБУРЭННЕ ГЕРМАНСКІМ ВЕРМАХТАМ ВЫТВОРЧЫХ АБ'ЕКТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ ВЫЗВАЛЕННЯ (1943–1944)

В статье представлены результаты научного анализа новых документальных и историографических источников, в том числе зарубежных, по выявлению исторических фактов о разработке и осуществлении германским вермахтом планов разрушения промышленных объектов на территории Беларуси. Автор показывает малоизвестные страницы истории военной повседневности на оккупированной белорусской территории, фокусируя научный поиск на отдельных отраслях восстановленного и действующего промышленного производства вместе с имеющимся ограниченным потенциалом местной рабочей силы. На основе введения новых данных выявлены масштабные последствия реализации «планов разрушения» на территории Беларуси накануне ее освобождения в 1943–1944 гг.

Пасля краху плана "Барбароса" адметным законам для германскай акупацыйнай улады і ваеннай эканомікі становіцца максімальна поўнае выкарыстанне як вытворчага патэнцыялу, так і людскіх рэсурсаў, якія знаходзіліся на захопленай савецкай да таго часу тэрыторыі, у тым ліку тэрыторыі Беларусі [1, S. 333]. Аднак практычная рэалізацыя гэтай эканамічнай палітыкі насіла абмежаваны характар па прычыне таго, што пасля пераможнага завяршэння Сталінградскай бітвы назіралася скарачэнне колькасці прадпрыемстваў і занятага на іх мясцовага насельніцтва, якое знаходзілася ў тылавой зоне, дзе дзейнічала германская акупацыйная ўлада (табл. 1).

Т а б л і ц а 1

Галіновая занятасць на цэнзавых прадпрыемствах у тыле групы армій "Цэнтр" (на студзень 1943 г.) [2, Bl. 11]

| Галіна вытворчасці | Колькасць прадпрыемстваў | Колькасць занятых |
|---|---|---|
| Торфанарыхтоўчая | 74 | 14 527 |
| Металаапрацоўчая | 63 | 3698 |
| Хімічная | 49 | 2526 |
| Тэкстыльная | 106 | 8382 |
| Шкляная і керамічная | 21 | 2307 |
| Будаўнічая | 67 | 2824 |
| Дрэваапрацоўчая | 54 | 2501 |
| Скураная | 49 | 1831 |
| Іншыя | 24 | 890 |
| **Увогуле** | **507** | **39 498** |

Аналіз геаграфіі прамысловай вытворчасці летам 1943 г. на тэрыторыі Гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр” (уключаючы заходнія раёны РСФСР) паказвае канкрэтную колькасць і дае магчымасць убачыць ступень канцэнтрацыі прамысловых прадпрыемстваў: назіраўся іх рост у напрамку з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Іх агульная колькасць скарацілася за паўгода на 17 % і складала на канец чэрвеня 1943 г. 672 прадпрыемствы, дзе працавалі каля 40 тыс. чалавек (гэта складала менш 10 % ад усіх занятых на тагачаснай акупаванай тэрыторыі СССР) [3, Bl. 24]. Так, на тэрыторыі вядучай гаспадарчай каманды Віцебск знаходзілася каля 1/6 усіх прадпрыемстваў Гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр” з колькасцю занятых на іх 5,1 тыс. чалавек (каля 11,4 %). На тэрыторыі каманды Орша працавалі 159 прамысловых аб’ектаў (30 %) з 16,2 тыс. рабочых (36,5 %). Найбольшая колькасць прадпрыемстваў знаходзілася на тэрыторыі гаспадарчай каманды Бабруйск – 173 (32,2 %), на якіх працавалі 18,8 тыс. чалавек (42,3 %). Сітуацыя мала змянілася ў параўнанні з летам 1942 г., калі ва ўсходняй частцы Беларусі ў параўнанні з заходнімі абласцямі Расійскай Федэрацыі, якія ўваходзілі ў зону дзейнасці Гаспадарчай інспекцыі Цэнтр, знаходзілася звыш 8/10 усіх прадпрыемстваў і больш 9/10 ад агульнай колькасці занятых у прамысловай вытворчасці. У лічбах гэта складала 40,1 тыс. чалавек, ці 90,5 %, з якіх 1/3 былі жанчыны [4, арк. 296 адв.]. Праз год (па стане на 1.7.43 г.) агульная колькасць занятых у прамысловасці павялічылася да 67 241 чалавека, сярод якіх мужчыны складалі 61,3 %, а жанчыны – 38,7 % ад агульнай колькасці працуючых [5, Bl. 125]. Вядучымі галінамі пры гэтым з’яўляліся торфанарыхтоўка (47,0 % рабочых), тэкстыльная і папяровая індустрыя (14,2 %), энергетыка – 9,2 %.

Летам 1943 г. вялося будаўніцтва асобных прамысловых прадпрыемстваў. Так, на пачатак чэрвеня быў запланаваны пуск цэментнага завода ў Крычаве, на будаўніцтве якога працавалі 860 чалавек, у тым ліку савецкія ваеннапалонныя. Пры гэтым не хапала яшчэ 356 чалавек, паколькі іх трэба было прыцягваць з раёна, дзе ў пачатку сакавіка была праведзена вярбоўка рабочай сілы для будаўніцтва дарог. Наяўны рэзерв рабочай сілы не здолелі выкарыстаць таксама па прычыне адсутнасці неабходных запасаў харчавання. Таму да работ прыходзілася прыцягваць дзяцей 16–17 гадоў, адрываючы іх ад навучання ў школе з тым, каб забяспечыць неадкладную выгрузку вугалю. Становішча з рабочай сілай ускладнялася і таму, што ў адпаведнасці з загадам камандавання сухапутных сіл вярбоўку свабодных рабочых рук можна было весці з 21 раёна толькі ў 6 (Клімавічскім, Мсціслаўскім, Крычаўскім, Шумяціцкім, Часлаўскім і Манастыршчынскім) і толькі часткова ў Смаленску. У астатніх раёнах вярбоўку весці было забаронена ў сувязі з актыўным прыцягненнем мясцовага насельніцтва да работ па стварэнні франтавых умацаванняў на “лініі пантэр” [6, Bl. 33]. У лютым 1944 г. на тэрыторыі, якая знаходзілася ў зоне дзейнасці ваеннай адміністрацыі, на будаўніцтве ваенных умацаванняў былі заняты 72 211 чалавек, пры гэтым не хапала 14 435 рабочых. Туды паступала рабочая сіла з Барысава, Бабруйска, Лепеля і іншых раёнаў [7, Bl. 14].

Улік насельніцтва, праведзены біржамі працы вядучых гаспадарчых каманд Віцебска, Оршы і Бабруйска, паказвае агульную карціну наяўнасці мясцовага насельніцтва ўвогуле і яго дзеяздольнай часткі на тэрыторыі Беларусі ў прыватнасці: агульная колькасць насельніцтва складала каля 3,5 млн чалавек, ці амаль 60 % ад усяго насельніцтва, якое было ўзята на ўлік Эканамічнай інспекцыяй "Цэнтр". Пры гэтым на тэрыторыі гаспадарчай каманды Віцебск на ўліку знаходзілася напалову менш насельніцтва, чым на тэрыторыі гаспадарчай каманды Бабруйск. Вясной 1943 г. на торфанарыхтоўках пад Оршай працавалі венгерскія яўрэі, якія былі адпраўлены назад у венгерскія вайсковыя часці [8, Bl. 52–54]. Недахоп працоўнай сілы патрабаваў прыцягнення да работ жанчын і прадстаўнікоў іншых катэгорый дзеяздольных людзей. Армейскае камандаванне бачыла якраз у іх асноўны кантынгент для фарміравання працоўных калон, якія будуць пастаянна знаходзіцца ў яго распараджэнні. Асаблівасцю павінна было стаць выкарыстанне для іх фарміравання толькі дзеяздольных і здаровых мужчын ва ўзросце ад 16 да 45 гадоў, жанчын і дзяўчат – ва ўзросце ад 18 да 35 гадоў. Дзяцей да такіх работ не прыцягвалі. Стварэнне такіх калон было звязана з правядзеннем значных аб'ёмаў земляных работ і павалу лесу для збудавання палявых умацаванняў, а асновай для камплектавання з'яўляўся прынцып прыналежнасці да пэўнай вёскі ці пэўнага раёна [9, Anlage II/38].

Па нашых падліках, на пачатак сакавіка 1943 г. на тэрыторыі Беларусі агульная колькасць прамысловых прадпрыемстваў складала 812 адзінак, на якіх былі заняты звыш 150 тыс. чалавек [10, арк. 2–82]. Большасць дзеючых прадпрыемстваў знаходзілася ў Мінску. Так, калі ў кастрычніку 1941 г. у горадзе працавала 51 прадпрыемства [11, арк. 47], дык праз паўтара гады на ўліку знаходзіліся 140 прамысловых аб'ектаў [12, с. 54] і 35 тыс. чалавек занятага гарадскога насельніцтва, апрача таго, 8,5 тыс. яўрэяў і 3 190 ваеннапалонных (пры агульнай колькасці жыхароў горада ў 105 тыс. чалавек). Аднак пры гэтым у горадзе на хапала амаль 6 тыс. спецыялістаў і ад 2 да 4 тыс. рознарабочых. Большая частка прадпрыемстваў з'яўлялася цэнзавай, гэта значыць, што колькасць занятых на такіх прадпрыемствах перавышала 20 чалавек [13, с. 196]. Усяго на прадпрыемствах генеральнай акругі Беларусь недахоп рабочай сілы ў канцы года (на 1.11.1943 г.) складаў 23 879 чалавек [14, Bl. 4]. У Генеральнай акрузе Беларусь на пачатак 1943 г. было 262 прадпрыемствы з агульнай колькасцю 9 925 рабочых [15, Bl. 384]. У беларускай савецкай гістарыяграфіі была прынята лічба ў 60 прадпрыемстваў [16, с. 18].

У нямецкай гістарыяграфіі адзначаецца, што ў пачатку 1943 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь знаходзілася ад 100 да 300 цэнзавых прадпрыемстваў, на якіх працавалі ад 7 да 12 тыс. чалавек [17, S. 386]. Айчынныя гісторыкі ў адным з найноўшых даследаванняў "Белорусские остарбайтеры" ўказваюць, што "ў канцы 1943 г. на прамысловых прадпрыемствах Генеральнай акругі Беларусь працавала звыш 100 тыс. чалавек" [18, с. 68], не прыводзячы доказнай часткі такой лічбы. Апрача таго,

з дакументаў вынікае, што адным з фактараў, які садзейнічаў часоваму пашырэнню тэхнічнай базы прамысловасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі, з’яўляўся вываз абсталявання з захопленых расійскіх і ўкраінскіх абласцей. Колькасць занятых на асобных прадпрыемствах вагалася пры гэтым ад 20 да 5 тыс. чалавек [13, с. 196].

У адносінах да апошняй лічбы размова ідзе аб уведзеным у строй летам 1942 г. “самым вялікім прадпрыемстве Остланда” [19, с. 51] (рамонтным заводзе “Groß K-Werk”: аналагічныя заводы планавалася пабудаваць для групы армій Поўдзень у Днепрапятроўску і для групы армій Поўнач у Пскове), адбудаваным у Мінску ў рамках “спецыяльнай праграмы па вытворчасці транспартных сродкаў” генеральным упаўнаважаным па вытворчасці спецыяльнай тэхнікі дырэктарам завода Даймлер Бенц (Daimler Benz) Якавам Верлінам [20, Bl. 39]. Пабудаваныя цэхі агульнай плошчай не менш за 76 тыс. м$^2$ [21, S. 24] выкарыстоўваліся для рамонту рознай тэхнікі (танкаў, цягачоў, легкавых і грузавых аўтамабіляў, матацыклаў) і асобных відаў узбраенняў [20, Bl. 32].

Цэхі будавалі 11 спецыяльных нямецкіх будаўнічых фірмаў пры ўдзеле больш за 300 спецыялістаў, апрача таго, былі задзейнічаны рэгулярныя часці будаўнічай арганізацыі Тодта, а таксама больш за 3,5 тыс. рабочых, у тым ліку 1 050 савецкіх ваеннапалонных і 2463 цывільных рабочых, з якіх: немцаў – 878, палякаў – 429, французаў і італьянцаў – 104, беларусаў 932 (у тым ліку 165 жанчын і 107 дзяцей) [19, с. 52]. Аднак гэтай колькасці рабочых не хапала, аб чым сведчаць заяўкі на пастаўку рабочай сілы ад 500 да 4,5 тыс. чалавек з Генеральнай акругі Беларусь [22, арк. 89]. Ва ўзведзеных цэхах бесперапынна вяліся рамонтныя работы, якія працягваліся практычна да эвакуацыі рамонтнага абсталявання і саміх рамонтных падраздзяленняў вермахта з Мінска ў пачатку лета 1944 г.

Важна адзначыць, што ў 1943 г. на акупаванай тэрыторыі Беларусі, акрамя буйнога прадпрыемства ў Мінску, знаходзіліся наступныя: самае вялікае торфапрадпрыемства – Асінторф пад Оршай (4 тыс. чалавек) [17, S. 388, 406], самы буйны дрэваапрацоўчы камбінат у Бабруйску (да 2 тыс. чалавек) [23, арк. 13], а таксама фанерная фабрыка ў Пінску (1,1 тыс. чалавек), пінская судаверф (900 чалавек) [24; 25], металаапрацоўчы завод у Бабруйску (872 чалавекі), цэментны завод у Крычаве (677 чалавек), запалкавая фабрыка ў Гомелі (558 чалавек), металакамбінат у Магілёве (493) чалавекі, канатная майстэрня ў Ветцы (460 чалавек) і інш. [26, арк. 10 адв., 12, 13].

На тэрыторыі Беларусі ў раёне дзейнасці Эканамічнай інспекцыі “Цэнтр” больш паловы (52,1 %) ад агульнай колькасці працуючых ва ўсіх сферах вытворчасці былі заняты на торфанарыхтоўках (табл. 2). Затым ішла тэкстыльная вытворчасць: тут пры агульным росце колькасці прадпрыемстваў ад 106 да 126 колькасць занятых складала 9 526 чалавек. Наступную пазіцыю ў гэтай структуры займала вытворчасць будматэрыялаў, колькасць прадпрыемстваў павялічылася ў 2,1 разы (з 67 да 143), а колькасць працуючых – у 1,8 разы (з 2824 да 5126 чалавек) і г.д. Сярод пастаянна дзеючых вытворчых аб’ектаў, на якіх актыўна выкарыстоўвалася мясцовая

рабочая сіла, асаблівае месца займала Галоўная чыгуначная дырэкцыя “Мінск”, дзе суадносіны нямецкай і мясцовай рабочай сілы было 1 да 3, ці 20 845 да 64 247 чалавек. Сярод занятых найбольшая колькасць насельніцтва выкарыстоўвалася для правядзення работ па бягучым рамонце пуцей – 34 596 чалавек, акрамя таго, машыністамі паравозаў працавалі 1942 чалавекі, у лакаматыўным дэпо – 3 144, у майстэрнях – 3 194, службе эксплуатацыі – 8 617, на ахове пуцей – 2 541 чалавек і г.д. [27, арк. 37]. Яшчэ больш значнымі былі суадносіны нямецкай, мясцовай і замежнай рабочай сілы, у тым ліку яўрэяў і савецкіх ваеннапалонных, на прадпрыемствах будаўнічай арганізацыі Тодта, дзе на аднаго нямецкага рабочага прыходзілася 29 чалавек мясцовай рабочая сілы [28, арк. 21].

Аднак пажаданага выніку ад прадпрыемстваў, уведзеных у дзеянне на акупаванай тэрыторыі Беларусі, кіраўніцтва Эканамічнага штаба Усход і Гаспадарчай інспекцыі “Цэнтр” так і не атрымалі. У першую чаргу гэта адносілася да такой галіны, як ільнаводства. Як вядома, часткова яго прадукцыя выкарыстоўвалася ў Германіі для вытворчасці падводных лодак. Але беларускія сяляне пастаянна змяншалі пасяўныя плошчы пад лён, паколькі імкнуліся ў першую чаргу забяспечыць сябе зернем і бульбай.

Табліца 2

Занятасць на прадпрыемствах і вытворчых аб’ектах галаўной групы “Эканоміка” Эканамічнай інспекцыі “Цэнтр” (1.07.1943) [5, Bl. 125]

| Галіна індустрыі | Колькасць занятай рабочай сілы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | % ад занятых | мужчын | % ад занятых | жанчын | % ад занятых |
| Торфанарыхтоўчая | 31 660 | 47,0 | 16 173 | 51 | 15 487 | 49 |
| Здабыча фасфатаў | 190 | 0,3 | 172 | 91 | 18 | 9 |
| Водныя і электрычныя станцыі | 6 199 | 9,2 | 5207 | 84 | 992 | 16 |
| Металаапрацоўчая | 3 771 | 5,6 | 406 | 90 | 365 | 10 |
| Хімічная індустрыя | 2 561 | 3,8 | 1512 | 59 | 1049 | 41 |
| Тэкстыльная і папяровая індустрыя | 9 526 | 14,2 | 4781 | 50 | 4745 | 50 |
| Скураная і футравая вытворчасці | 2 041 | 3,6 | 1420 | 70 | 621 | 30 |
| Вытворчасць шкла | 1 716 | 2,6 | 1150 | 67 | 566 | 33 |
| Дрэваапрацоўчая | 3 096 | 4,6 | 2589 | 83 | 507 | 17 |
| Табачная індустрыя | 510 | 0,8 | 97 | 19 | 413 | 81 |
| Здабыча вугалю | 435 | 0,6 | 248 | 57 | 187 | 43 |
| Вытворчасць цэглы | 3 792 | 5,6 | 3192 | 84 | 600 | 16 |
| Рамесная вытворчасць | 410 | 0,6 | 351 | 86 | 59 | 14 |
| Выраб соды | 233 | 0,4 | 189 | 81 | 44 | 19 |
| Вытворчасць цэменту | 793 | 1,2 | 556 | 70 | 237 | 30 |
| Здабыча выкапняў | 308 | 0,5 | 170 | 55 | 138 | 45 |
| **Індустрыя ўвогуле** | **67 241** | **100%** | **41 213** | **61,3** | **26 028** | **38,7** |

Больш усяго Беларусь была вядома за сваімі межамі пастаўкамі лесу і прадукцыі дрэваапрацоўкі. Аднак у выніку ўзмацнення дзейнасці партызан вясной 1942 г. нарыхтоўка лесу і сплаў драўніны ў вобласці тылу групы армій "Цэнтр" былі цалкам паралізаваны [29, с. 473]. Вясной 1943 г. на тэрыторыі Беларусі пад кантролем партызан знаходзілася 90 % лясных масіваў. Разам з тым статыстычныя матэрыялы Эканамічнага штаба "Ост" утрымліваюць звесткі, якія сведчаць пра тое, што Беларусь заставалася важнай крыніцай рэгулярных паставак лесу ва Украіну: у Днепрапятроўск, Запарожжа, Сталіна (Данецк). Так, на вясну 1943 г. з Барысава, Оршы, Магілёва, Бабруйска і Гомеля чарговая партыя лесу складала амаль 3 тыс. вагонаў [30, арк. 84]. Аднак на справе яна была сарвана ў выніку ўзмацнення дыверсійнай дзейнасці партызан.

У Генеральнай акрузе "Беларусь" заданні па нарыхтоўцы лесу, частка якога паступала ў Трэці рэйх, выконваліся ў рамках планавых заданняў практычна да лета 1944 г. і складалі адпаведна: у 1941/42 гаспадарчым годзе – 93 %, у 1942/43 – 92 % і ў 1943/44 – 87 % ад плана [31, Bl. 82]. Пры гэтым на тэрыторыі акругі штогод працавалі ад 90 да 150 лесапільных заводаў і піларам, на якіх штомесячна апрацоўвалася ад 220 да 260 куб. м піламатэрыялаў (з разліку на адну пілараму) [31, Bl. 84–85]. Галоўнымі заказчыкамі пры гэтым выступалі папяровая прамысловасць рэйха, вермахт, уключаючы будаўнічую арганізацыю Тодта, чыгунка [32, Bl. 37].

Да свайго адступлення з Беларусі акупацыйныя ўлады і германскія ваенныя часці кіраваліся прынцыпам татальнай эксплуатацыі і поўнага разбурэння. Для многіх беларускіх гарадоў і прамысловых аб'ектаў былі падрыхтаваны "календары разбурэння". На прыкладзе горада Глыбокае бачна, што да эвакуацыі нямецкая адміністрацыя акругі, камандаванне часцей вермахта і паліцыі выкарыстоўвалі ў гарадской гаспадарцы больш за 100 розных прамысловых і гаспадарчых аб'ектаў, якія ў пачатку 1944 г. былі ўключаны ў "каляндар разбурэнняў" камандуючага вермахтам у Беларусі. Прадугледжвалася знішчэнне агнём драўляных і разбурэнне каменных збудаванняў шляхам выкарыстання ўзрыўчаткі [33, S. 389–393].

Найбольш каштоўныя ў гаспадарчым плане прамысловыя аб'екты, абсталяванне, машыны і сыравіну гаспадарчыя каманды спрабавалі вывезці ў рэйх пры эвакуацыі з тэрыторыі Беларусі. Так, пры эвакуацыі з Барысава штаба Эканамічнай інспекцыі "Цэнтр" праз станцыю Граева ў Вільнюс былі вывезены з усімі наяўнымі на той час рэсурсамі наступныя прадпрыемствы горада: завод металаапрацоўкі, матэрыялы цэнтральнага склада, запалкавая і скураная фабрыкі, запасы другаснай сыравіны і абсталяванне ваеннага дэпо і інш. [34, S. 400–401]. Сума агульных страт, нанесеных дзяржаўным прамысловым аб'ектам, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі да пачатку вайны, складала 6 225,2 млн рублёў [35, с. 420].

Дырэктыўныя палажэнні для правядзення не толькі эканамічнай эвакуацыі, але і татальнага вынішчэння прамысловых і сельскагаспадарчых

аб’ектаў, абсталявання і машын, сыравінных рэсурсаў і гатовай прадукцыі і іншага з захопленай савецкай тэрыторыі ўтрымлівала распараджэнне Эканамічнага штаба “Ост” «Аб поўным рабаванні і разбурэнні эканамічных аб’ектаў у ходзе эвакуацыі часцей вермахта з акупаванай савецкай тэрыторыі» ад 1 чэрвеня 1944 г. [36, S. 389–393]. У адпаведнасці з ім эвакуацыя праводзілася ў некалькі этапаў. Галоўным вынікам першага этапу, які меў назву “разгрупаванне”, павінна было быць своечасовае правядзенне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы будучай “эвакуацыі” як другога этапу. Эвакуацыя мела некалькі мэтаў: 1) захаванне на акупаванай тэрыторыі асабовага складу і выкарыстанне наяўных матэрыяльных рэсурсаў для ўзмацнення ўласных баявых дзеянняў і ваеннай эканомікі; 2) пазбаўленне праціўніка ўсяго таго, што можа служыць узмацненню яго баявой дзейнасці і ваеннай эканомікі; 3) у ходзе правядзення эвакуацыі перавага аддаецца баявым часцям вермахта (перш за ўсё ў разгрузцы падвозных дарог). У той час эвакуацыя прадугледжвала: адвод і захаванне асабовага складу, мірнага насельніцтва і запасаў, у тым ліку жывёлы, любых рэсурсаў, машын, абсталявання, гатовай прадукцыі і ўсяго іншага з мэтай іх далейшага выкарыстання. Для правядзення эвакуацыі выкарыстоўваліся любыя сродкі перавозкі і дастаўкі. Трэці этап эвакуацыі называўся “падаўленне”. У ходзе яго павінны былі вырашацца такія важныя задачы, якія для праціўніка ствараюць сур’ёзныя перашкоды для хуткага ўвядзення ў строй жыццёва важных збудаванняў, адкрыцця прадпрыемстваў і выкарыстання машын і абсталявання. Да гэтага могуць прывесці дзеянні, звязаныя з вывадам усяго гэтага са строю, вывазам ці размяшчэннем у недаступных месцах жыццёва важных збудаванняў, прадпрыемстваў і абсталявання. За вырашэнне гэтых задач нёс адказнасць прадстаўнік гаспадарчай службы ці кіраўнік прадпрыемства. Заключны этап называўся “разбурэнне”. Галоўнай яго мэтай з’яўлялася стварэнне любымі сродкамі перашкод для эканамічнага выкарыстання праціўнікам эвакуацыйнай вобласці і яе рэсурсаў. Апошнюю задачу выконвалі воінскія падраздзяленні. Усе гэтыя мерапрыемствы складалі аснову “календароў эвакуацыі” германскіх акупантаў з тэрыторыі Беларусі, пакідаючы якую, вермахт прыводзіў іх у дзеянне, ператвараючы беларускую зямлю ў мёртвую пустыню [36, S. 393].

## ЛІТАРАТУРА

1. Der deutsche Überfall auf die Sowjetunion. „Unternehmen Barbarossa“ 1941 / hrsg. von Gerd R. Ueberschär und Wolfram Wette. – Frankfurt am Main, 1999.
2. In Gang gesetzte Industriebetriebe (Chefgruppe W) in den militärverwalteten Ostgebieten (ohne Kleinbetriebe): Chefgruppe W AW VI Statistik vom 29. Januar 1943 // BA-MA. – RW 31/260.
3. Überblick über die Beschäftigung in der Gewerblichen Wirtschaft der Besetzten Ostgebiete vom 6. Juli 1943, Wi Stab Ost, Chefgruppe W. Abteilung Allgemeine Wirtschaft, Nr. 84496/43 geh. // BA-MA. – RW 31/260.

4. Wi In Mitte Chefgruppe, Gruppe Statistik, Az. 8057, die wirtschaftliche Struktur des Raumes der Wirtschaftsinspektion Mitte unter Zugrundelegung der Beschäftigungszahlen nach dem Stande vom 31.8.42 // НАРБ. – Ф. 412. – Воп. 1. – Спр. 113.
5. Statistischer Arbeitsausschuss der Wi In Mitte : Statistischen Bericht Nr. 1 v. 30. Juli 1943 // BA-MA. – RW 31/570.
6. KTB Nr. 7 des Wi Kdo 203 Klimowitschi, 2. Vierteljahr 1943, Lagebericht für die Zeit vom 16.3. bis 15.4.1943, Anlage 6 vom 16. April 1943; Wi Kdo Klimowitschi, Gruppe Arbeit, Az. 4012 // BA-MA. – RW 31/775.
7. Wi Stab Ost, Stab Abt. I/Ic/Br.B. Nr. 920/44 geh.: Die wirtschaftliche Lage in den besetzten Ostgebieten: Monatsbericht Wi Stab Ost vom 1.2. bis 29.2.1944 // BA-MA. – RW 31/113.
8. KTB Nr. 3 Ltd. Wi Kdo 211 Orscha: Arbeitseinsatz. Bericht vom 23.5.1943 // BA-MA. – RW 31/843.
9. KTB des Wi Kdo 201 Orel vom 1.4. bis 30.6.1943: Einsatz von landeseigenen Arbeitskräfte, hier – Aufstellung von Arbeitskolonnen von 15. 6.1943. Anlage II/38 // BA-MA. – RW 31/763.
10. Wi In Mitte, Chefgruppe W, Gr. Statistik, Verzeichnis der arbeitenden Betriebe der Chefgruppe W und Chefgruppe FH nach dem Stande vom 1.03.43 // НАРБ. – Ф . 412. – Воп. 1. – Спр. 189.
11. Rü Kdo Minsk, Gr. BB, Lagebericht für Monat September v. 11.10.41 // НАРБ. – Ф. 412. – Воп. 1. – Спр. 19.
12. *Новікаў, С.* Адлюстраванне ў айчыннай і германскай гістарыяграфіі эканамічнай палітыкі нацысцкай Германіі ў Беларусі / С. Новікаў // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2003. – № 2.
13. *Новікаў, С.Я.* Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941–1944 гг.: Агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў / С. Новікаў. – Мінск, 2002.
14. RKO, Arbeitseinsatz: Vermerk für Herrn Gauleiter Lohse, Anlage I: Kräftebedarf im Ostland, 1.11.43 // Латвійскі дзяржаўны гістарычны архіў (Latvijas Valsts Vestures Arhivs, далей LVVA). – P-70. – Ap. 5. – L. 13.
15. Statistische Berichte füer das Ostland. Nr. 11/12 (November / Dezember 1943) // LVVA. – P-69. – Ap. 2. – L. 75
16. *Олехнович, Г.И.* Экономика Белоруссии в условиях Великой Отечественной войны (1941–1945) / Г.И. Олехнович. – Минск, 1982.
17. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg, 1999.
18. Белорусские остарбайтеры: Историко-аналитическое исследование / под ред. Г.Д. Кнатько. – Минск, 2001.
19. *Новікаў, С.* Гаспадарчая каманда “Мінск”: вынікі першага года дзейнасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі / С. Новікаў // Другая сусветная вайна: новыя аспекты даследавання. – Мінск, 2004.

20. Chefgruppe W, Abt. Allg.W, VI b, Statistik: Beschäftigte Industriebetrieben in besetzten Ostgebieten // BA-MA. – RW 30/260.
21. Zwangsarbeit bei Daimler Benz. – Stuttgart, 1994.
22. Der Bevollmächtigte des Generalbevollmächtigten für die Regelung der Bauwirtschaft, Bezirk Minsk, Sonderbau Werlin, Frontführung v. 31.3.1943 // НАРБ. – Ф. 393. – Воп. 3. – Спр. 321.
23. Forst- und Holzwirtschaft in den bis zum Sommeroffensive besetzten Gebieten, Stand und Planung für 1943 // РГВА. – Ф. 700-К. – Воп. 1. – Спр. 49.
24. BA-MA. – RW 30/155: Liste der Betriebe GebK Pinsk v. 25. Mai 1943.
25. RMfbO, Schr. Nr. 223 v. 3.6.42: Die Neuordnung für Handwerk in der Ukraine // Institut für Zeitgeschichte (IfZ). MA 795.
26. Wi In Mitte, Chefgruppe W, Gruppe Statistik: Arbeitende Betriebe auf Grund der vorliegenden Angaben v. 1.5.1943 // НАРБ. – Ф. 412. – Воп. 1. – Спр. 189.
27. Verhältnisse der Arbeitstätigen der HED Minsk. Stand vom 28.2.43 // НАРБ. – Ф. 378. – Воп. 1. – Спр. 577.
28. Tätigkeit des OT-Einsatzes Weißruthenien mit Angaben zur Zahl der jüdischen und nichtjüdischer Arbeiter, vom November 1943 // НА РБ. – Ф. 370. – Воп. 1. – Спр. 53.
29. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. – Минск, 1983. – Т. 1.
30. Sonderbeauftragter für die Holzverwaltung Südost, Abt. III, Az. 105, Holzabtransport aus dem Bereich der HGMitte zur HGSüd, 26.03.43 // РГВА.– Ф. 700-К. – Воп. 1. – Спр. 50.
31. Der GenKW, HA Fo u. Ho, Abwicklungsstelle, Tätigkeitsbericht über die seit Errichtung der Zivilverwaltung geleistete Arbeit, 5.9.1944 // BA. – R 6/289.
32. Der Generalkommissar in Minsk, Abt. II Verw., Lagebericht v. 15. Oktober 1942 // BA. – R 93/3.
33. Auszug aus einem Zerstörungskalender des Wehrmachtbefehlshabers Weißruthenien mit den in der Stand Glebokie zu vernichtenden Betreibe und Einrichtungen, o. D. (Frühjahr 1944) // Okkupation. Raub. Vernichtung. Dokumente zur Besatzungspolitik der faschistischen Wehrmacht auf sowjetischen Territorium 1941 bis 1944 / herg. von Norbert Müller. – Berlin, 1980.
34. Abschlußbericht des Wehrwirtschaftskommandos 22 über Räumung und Zerstörung von Stand und Gebiet Wilnijus in der Zeit vom 1. – 10.7.1944, o.D. // Okkupation. Raub. Vernichtung. Dokumente zur Besatzungspolitik der faschistischen Wehrmacht auf sowjetischen Territorium 1941 bis 1944 / herg. von Norbert Müller. – Berlin, 1980.
35. Из отчета Белорусской республиканской комиссии содействия в работе Чрезвычайной государственной комиссии СССР по установлению и расследованию злодеяний немецко-фашистских захватчиков об ущербе, причиненном немецко-фашистскими захватчиками народному хозяйству и гражданам Белорусской ССР в 1941–1944 гг. // Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941–1944. – Минск, 1965.

36. Aus der vom Chef des Wirtschaftsstabes Ost erlassenen Wirtschaftsräumungs-ordnung zur restlosen Ausplünderung und Zerstörung der okkupierten sowjetischen Gebiete beim Rückzug der faschistischen Truppen, vom 1. Juni 1944 // Okkupation. Raub. Vernichtung. Dokumente zur Besatzungspolitik der faschistischen Wehrmacht auf sowjetischen Territorium 1941 bis 1944 / herg. von Norbert Müller. – Berlin, 1980.

*Поступила в редакцию 05.03.14*